• развитие научной инфраструктуры и систем научно-технической информации;

• формирование специальных бюджетных и внебюджетных фондов поддержки наиболее перспективных научных направлений и наиболее талантливых ученых;

• создание достойных условий жизни и работы ученых [2].

Таким образом, необходимо активное введение научно-технической и образовательной сфер в число стратегических приоритетов в реформировании экономики и преобразовании промышленного потенциала страны.

Следует отметить, что среди основных факторов экономического роста, на современном этапе развития, на первый план выходят не финансовый капитал и средства производства, а знания и новые идеи, обеспечивающие выпуск инновационной, конкурентоспособной продукции, востребованной на рынке и за которую потребитель готов платить высокую цену. Именно инновационно-интеллектуальный характер экономики обеспечивает экономическую безопасность государства и более высокий уровень жизни населения. Высокая степень развития науки определяет экономический рост и тянет за собой всю остальную экономику, заставляя ее адаптироваться к новейшим инновационным технологиям.

**Список использованных источников**

1. *Дупелин, Ю. А.* Трансфер инноваций и государственная экономическая политика / Ю. А. Дупелин, Н. В. Казакова // Инновации. – 2009. – № 11(133). – С. 61.

2. *Глазов, М. М.* Научно-технический фактор обеспечения экономической безопасности [Электронный ресурс] / М. М. Глазов, И. П. Фирова. – Режим доступа: http://rus.neicon.ru:8080/xmlui/bitstream/handle/123456789/6133/7_10_04_03.pdf?sequence=1.

***І. В. Грабянчук***
*Рэспубліка Беларусь, Бабруйск*

# ПРАЦОЎНЫЯ МАБІЛІЗАЦЫІ Ў БАБРУЙСКАЙ ВОБЛАСЦІ Ў 1945 г.

Слова «мабілізацыя» звычайна ўжываецца для абазначэння масавага прызыву ваеннаабавязаных у войска ў выпадку пачатку вайны. Аднак у Савецкім Саюзе яно яшчэ абазначала і метад набору

неабходнай колькасці працоўнай сілы для выканання гаспадарчых задач на завяршаючым этапе Вялікай Айчыннай вайны. Такія мерапрыемствы праводзіліся і на тэрыторыі Бабруйскай вобласці, якая была створана ў верасні 1944 г. Для іх ідэалагічнага абгрунтавання ў адным з перадавых артыкулаў абласной газеты «Савецкая Радзіма» была дадзена наступная ўстаноўка: «Для бальшавікоў няма і не можа быць цяжкасцей, якіх нельга было б пераадолець. У тыле працаваць па-франтавому – такі павінен быць наш лозунг. А для франтавікоў няма перашкод на шляху выканання пастаўленай задачы» [1]. Прававой асновай правядзення прымусовых мабілізацый працоўнай сілы служылі нарматыўныя акты саюзных, рэспубліканскіх партыйных і савецкіх органаў, а таксама рашэнні абласных выканаўчых камітэтаў Саветаў дэпутаў працоўных.

Крыніцы, якія захоўваюцца ў Бабруйскім занальным дзяржаўным архіве, дазваляюць скласці агульнае ўяўленне аб мэтах правядзення працоўных мабілізацый на тэрыторыі новастворанай вобласці на працягу трох кварталаў 1945 г. Асноўныя звесткі пра іх пададзены ў наступнай табліцы.

*Табліца 1*

**Мабілізацыі працоўнай сілы на тэрыторыі Бабруйскай вобласці ў 1945 г.**

| Органы, якія праводзілі мабілізацыю | Час правядзення мабілізацыі | Колькасць мабілізаваных (чал.) | Мэта мабілізацыі |
|---|---|---|---|
| Парыцкі райвыканкам | Студзень 1945 | 28 | Вываз на фурманках 4 тыс. кубаметраў драўніны «Белрачлесу» для аднаўлення суднаверфі ў в. Шацілкі Парыцкага раёна |
| Бабруйскі гарвыканкам | Люты 1945 | 200 | Аднаўленне Бабруйскага домабудаўнічага камбіната |
| Бабруйскі гарвыканкам | Люты 1945 | 80 | Аднаўленне Бабруйскай мэблевай фабрыкі імя С. Халтурына |

*Працяг табліцы 1*

| **Органы, якія праводзілі мабілізацыю** | **Час правядзення мабілізацыі** | **Колькасць мабілізаваных (чал.)** | **Мэта мабілізацыі** |
|---|---|---|---|
| Бабруйскі гарвыканкам | Першы квартал 1945 | 750 | Будаўніцтва Бабруйскага гідролізнага завода «Галоўлесаспірта» |
| Бабруйскі райвыканкам | Сакавік 1945 | 30 | Аднаўленне Бабруйскага дому адпачынку |
| Бабруйскі гарвыканкам | Сакавік-Красавік 1945 | 100 | Аднаўленне Бабруйскай швейнай фабрыкі імя Ф. Дзяржынскага |
| Асіповіцкі райвыканкам | Сакавік-Красавік 1945 | 200 | Праца ў саўгасе «Кастрычнік» Асіповіцкага раёна |
| Бабруйскі райвыканкам і Бабруйскі гарвыканкам | Другі квартал 1945 | 200 | Аднаўленне, будаўніцтва і эксплуатацыя прадпрыемстваў Наркамбуд-матэрыялаў БССР |
| 13 райвыкан-камаў Бабруйскай вобласці | Другі квартал 1945 | 500 | Накіраванне ў распараджэнне «Прамграмадзян-буда» («Промграждан-строя»), г. Масква |
| 9 райвыкан-камаў Бабруйскай вобласці | Май 1945 | 300 | Выкананне пуцявых і будаўнічых работ на Свярдлоўскай чыгунцы |
| Бабруйскі гарвыканкам | Чэрвень 1945 | 80 | Паляпшэнне працы Бабруйскай мэблевай фабрыкі імя С. Халтурына |
| 5 райвыкан-камаў і 2 гар-выканкамы Бабруйскай вобласці | Ліпень 1945 | 740 | Мабілізацыя насельніцтва на сельскагаспадарчыя работы |

| **Органы, якія праводзілі мабілізацыю** | **Час правядзення мабілізацыі** | **Колькасць мабілізаваных (чал.)** | **Мэта мабілізацыі** |
|---|---|---|---|
| Мінскі тонкасуконны камбінат пры садзеянні 4-х райвыканкамаў Бабруйскай вобласці | Ліпень-Жнівень 1945 | 100 | Арганізаваны набор рабочых для аднаўлення Мінскага тонкасуконнага кабіната тэкстыльнай прамысловасці БССР |
| Галоўлесхім-прам пры садзеянні 8-мі райвыканкамаў Бабруйскай вобласці | Трэці квартал 1945 | 170 | Арганізаваны набор рабочых для выканання работ на лесахімічных прадпрыемствах |
| Бабруйскі лесакамбінат і мэблявая фабрыка імя С. Халтурына пры садзеянні 13 райвыкан-камаў Бабруйскай вобласці | Трэці квартал 1945 | 750<br>175 | Арганізаваны набор рабочых для Бабруйскага лесакамбіната, мэблевай фабрыкі імя С. Халтурына |
| Усяго | | 4403 | |

*Заўвага.* Крыніцы [2, спр. 72, арк. 37, 120; спр. 73, арк. 49, 53, 55, 292; спр. 74, арк. 14-15, 60-61, 285; спр. 75, арк. 138-139, 152, 161; спр. 76, арк. 101].

З прыведзенай табліцы відаць, што асноўная частка мабілізаваных работнікаў накіроўвалася на аднаўленне прамысловых прадпрыемстваў БССР, у тым ліку ў Бабруйску. Пасля завяршэння вайны слова «мабілізацыя» замянілі на «арганізаваны набор рабочых (рабочай сілы)». Такія наборы праводзілі самі прадпрыемствы пры арганізацыйнай дапамозе мясцовых органаў улады, што адлюстравана ў апошніх трох радках табліцы.

Які маштаб мелі працоўныя мабілізацыі на тэрыторыі Бабруйскай вобласці і якім быў іх эканамічны эфект? Даць поўны адказ на

гэтыя пытанні пакуль няма магчымасці. Аўтарам праведзена першапачатковая апрацоўка звестак па тэме даследавання, якія ўтрымліваюцца ў архіўных крыніцах. Напрыклад, вядома, што паводле плана мабілізацыі гарадскога і сельскага насельніцтва на ўборку ўраджаю ў 1945 г. агульная патрэба ў працоўнай сіле па Бабруйскай вобласці ацэньвалася ў 177 865 чалавек, а за тры летнія месяцы планавалася мабілізаваць 7500 чалавек, ці 0,42 % ад гэтай лічбы [2, спр. 75, арк. 140]. Пры гэтым, як паказана ў табліцы, у ліпені 1945 г. было мабілізавана 740, а ў плане на гэты месяц запісана 1000 чалавек.

Выкананне планаў працоўных мабілізацый было дастакова складанай задачай для мясцовых органаў улады. Так, 13 студзеня 1945 г. на пасяджэнні Бабруйскага абласнога камітэта разглядалася пытанне аб ходзе мабілізацыі працоўнай сілы для Наркамчормета па Кіраўскаму раёну. У пратаколе пасяджэння канстатуюцца дрэнныя вынікі працы па гэтаму раёну: «Отсутствие надлежащей массово-разъяснительной работы среди населения привело к тому, что часть мобилизуемых уклонилась от мобилизации и Райисполком никаких мер воздействия к уклоняющимся от мобилизации не принял. В результате плохой работы Кировский Райсовет выполнил наряд мобилизации на 31 %» [2, спр. 72, арк. 20]. Бабруйскі аблвыканкам абавязаў Кіраўскі райсавет завяршыць працоўную мабілізацыю на працягу тыдня – да 20 студзеня 1945 г.

Аб непапулярнасці мабілізацый працоўнай сілы сярод насельніцтва Бабруйскай вобласці сведчыць яшчэ адзін дакумент. У лютым 1945 г. абласны выканаўчы камітэт прыняў адмысловае рашэнне, накіраванае на барацьбу з «дэзерцірамі», якія былі мабілізаваны ў 1944 – пачатку 1945 гг. У ім прыводзяцца канкрэтныя прыклады: з Тулы з абарончага завода ўцёк назад у родны горад жыхар г. Старыя Дарогі, а з Краматорска – жыхарка Глускага раёна ў свой калгас. Абодва дома ўладкаваліся на працу. Рашэнне аблвыканкама забараняла кіраўнікам прадпрыемстваў і калгасаў прымаць «дэзерціраў прамысловасці» пад пагрозай прыцягнення іх да крымінальнай адказнасці, а выяўленых уцекачоў прадпісвала накіроўваць у пракуратуру [2, спр. 72, арк. 98].

Такім чынам, гучных ідэалагічных лозунгаў і «массово-разъяснительной работы» было яўна недастаткова для ажыццяўлення працоўных мабілізацый. Як прымусовае мерапрыемства яны патрабавалі і сістэматычных рэпрэсіўных захадаў. Мабілізацыі працоўнай сілы, аднаго боку, садзейнічалі аператыўнаму вырашэнню задач ад-

наўлення народнай гаспадаркі Бабруйскай вобласці, але, з другога боку, адцягвалі пэўную частку так неабходных працоўных рэсурсаў за межы Беларусі (за тры кварталы 1945 г. – 18 %: 500 чалавек ў Маскву і 300 ў Свярдлоўск з 4403 мабілізаваных). Падкрэслім, што гэта яшчэ далёка не поўныя дадзеныя.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Паспяхова завяршыць гаспадарчы год // Савецкая Радзіма. – 1944. – 13 снежня. – С. 1.

2. Матэрыялы да пратаколаў пасяджэнняў Бабруйскага абласнога выканаўчага камітэта // Бабруйскі занальны дзяржаўны архіў. – Ф. 254. – Воп. 1. – Спр. 72–76.

***Д. И. Дадеркина***
*Республика Беларусь, Бобруйск*

# ПРИРОДООХРАННАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ В ОАО «РОГАЧЕВСКИЙ МОЛОЧНО-КОНСЕРВНЫЙ КОМБИНАТ»

ОАО «Рогачевский молочно-консервный комбинат» – крупнейшее молокоперерабатывающее предприятие Республики Беларусь и является источником загрязнения окружающей среды региона.

В организации функционирует отдел охраны окружающей среды, который планирует и координирует работы по охране атмосферного воздуха, почв, водных ресурсов.

Система управления окружающей средой (СУОС) внедрена на предприятии в 2007 г. Руководство по СУОС содержит описание политики в области охраны окружающей среды, документированных процедур по организации работ, видов деятельности и процессов и их взаимодействия, а также регламентирует распределение обязанностей, полномочий и ответственности в системе управления окружающей средой.

Экологическая политика декларирует основные направления деятельности в области охраны окружающей среды:

- постоянное совершенствование экологической деятельности;
- предотвращение загрязнения;
- соответствие законодательным и нормативным требованиям;
- поддерживание связей с общественностью;